## ФІЗКУЛЬТУРА І СПОРТ

# Да сустрэчы ў Мінску!

Дружба стралкоу нашага універсітэта і Маскоускага нафтавага інстытута імя Губкіна пачалася з мінулага года, калі студэнты-нафтавікі прыязджалі да нас у Мінск на таварыскую сустрэчу. Спаборніцтва з вялікай перавагай выйгралі госці.

Візіт у адказ стралкі універсітэта правялі у час зімовых канікул. Масквічы сустрэлі нас вельмі ветліва. Студэнты інстытута вадзілі нас у Крэмль. Разам з імі мы пабывалі у маўзалеі Леніна і Сталіна, наведалі Трэцякоускую галерэю і высотны будынак МДУ імя Ламаносава, адкуль любаваліся велічнай панарамай Масквы.

Спаборніцтвы пачаліся у ціры інстытута 2 лютага. Цір інстытута—50-мятровы, двухпавярховы, на 8 стралкоу. Ён добра ацеплены, мае стралковы клас і выкладчыцкую. Зроблены сілуэтныя мішэні для стральбы з пісталетау. У ціры чыста і утульна.

За каманду інстытута выступалі вядомыя майстры меткага агню, чэмпіёны ДТСААФ Эпінбайм, Ніязау, Аверын. Яны і забяспечылі сваёй камандзе першае месца у гэтым відзе спаборніцтвау. Нядрэнны вынік паказау Яніс Эпінбайм (583 ачкі). Лепшым сярод нашых стралкоу быу Леу Кабановіч (564 ачкі).

У другі дзень нашы дзяўчаты, сярод якіх добрым вынікам парадавала майстар спорту Іна Загорская, узялі першынства над дзяучатамі інстытута. Лік стау нічыйным 1:1.

Трэці дзень павінен быу выявіць пераможца. Многія удзельнікі вельмі хваляваліся і выступалі ніжэй сваіх магчымасцей. Асабліва гэта было прыкметна у нашай мужчынскай камандзе. Дзяўчаты выступалі рауней: у практыкаванні 3x25 па стральбе з пісталета яны зноу перамаглі гаспадароў спаборніцтвау. Лік стаў 2:1 у нашу карысць. Але вечарам мужчынская каманда ў стральбе з пісталета на 50 метрау зноу прайграла вопытным майстрам. Лепшы вынік быу у Яніса Эпінбайма (147). Нават лепшы сярод нашых стралкоу Леў Кабановіч выбіу на 1 ачко менш за горшага стралка нафтавікоў. Агульны лік сустрэчы стаў нічыйным. Але каманда нафтавага інстытута мела агульную суму ачкоў на 198 больш. Па гэтай прычыне першынство засталося за масквічамі.

Перамога студэнтаў-нафтавікоу, бясспрэчна, не выпадковая. Гэта—вопытныя стралкі, неаднаразовыя удзельнікі Усесаюзных спаборніцтваў. Большасць з іх уваходзяць у склад зборнай каманды ДТСААФ Савецкага Саюза. Нашы-ж стралкі у большасці сваёй маладыя, не маюць такога вопыту. У спаборніцтвах яны хваляваліся і паказвалі вынікі значна ніжэйшыя, чым на трэніроўках. Таму неабходна больш праводзіць таварыскіх сустрэч з лепшымі камандамі ВНУ Мінска і спартыуных таварыствау.

Цёпла праводзілі нас масквічы.

— Да сустрэчы ў Мінску, сябры!

**В. С. ХРЭНАЎ.**

# НОВЫЯ ВЕРШЫ А. ВЯРЦІНСКАГА

## СВЯШЧЭННАЯ ЗЯМЛЯ

*Святочная свежасць на вуліцах Дэлі.*
*Палац прэзідэнцкі.*
*Раскошны пакой*
*Адкрыты для ўсіх, каб усе глядзелі*
*Дары—сімвал дружбы людской.*
*Ідуць сюды клеркі, ідуць сяляне,*
*Ідуць студэнты і рабочы люд.*
*Ідуць—а у сэрцах іх хваляванне,*
*Прыходзяць—і шапкі здымаюць тут.*
*О, дружаць індыйцы верна і шчыра.*
*І сёння яны пакланіцца прышлі*
*Яшчэ небывалым сувенірам,—*
*Са слаўнай савецкай зямлі.*
*Глядзяць з захапленнем на дзіўную вазу,*
*Тканіны узорныя вабяць іх.*
*Праходзяць далей—і неяк адразу*
*На усё забываюць, змаўкаюць уміг.*
*У вочы кідаецца нешта такое,*
*Што ўбачыш—і у сэрцы тваім перабой.*
*Што ўбачыш—і у сэрцы няма спакоя—*
*Каробачка простая з зямлёй.*
*З зямлёй, сталінградскай далёкай зямлёю*
*Стаіць на узвышэнні яна.*
*Прыціхлі індыйцы перад ёю,*
*Узрушаныя спауна.*
*Прыціхлі, не, гэта не тое слова.*
*Пагляды іх цёмных вачэй*
*Успыхнулі неяк трывожна—сурова,*
*І з кожнай мінутай ярчэй і ярчэй.*
*У гэтых паглядах—і святасць пашаны,*
*І удзячнасці вернай парыу*
*Да тых, хто калісьці самааддана*
*За шчасце сваю кроў праліў.*
*Прыгледзішся—здасца, што кроплі крыві той*
*Цямнеюць у шэрым камочку зямлі...*
*Глядзяць індыйцы з пашанай адкрытай,*
*Глядзяць, адыходзячы, здалі.*
*І поўняцца сэрцы любоўю брацкай*
*Да рускіх, да слаўнай народнай сям'і...*
*...Вось так-бы па жменьцы зямлі сталінградскай*
*Раскінуць па усёй неабдымнай зямлі.*
*Раскінуць усюды, дзе толькі ёсць людзі.*
*Ідзіце, глядзіце—малы і стары!*
*Хай гэта зямля вам сэрцы будзіць,*
*Вялікую праўду хай азарыць.*
*І як паломнікі калісь у Меку,*
*Нібыта святую, ішлі,*
*Хай чалавек за чалавекам*
*Ідуць да свяшчэннай зямлі.*
*І будзе яна адкрываць ім вочы,*
*Заслоненыя ілжой,*
*І пойдуць людзі дамоў аднойчы*
*З прасветленаю душой.*
*Яны зразумеюць верна і шчыра,*
*Дзе праўда, а дзе мана,*
*Хто хоча людзям шчасця і міру,*
*А каму—патрэбна вайна.*

## *МАЦІ ЧАКАЕ СЫНА*

Стракоча сарока, стракоча.
Аб чым расказаць яна хоча,
Другім, можа быць, і няўцям.
А маці? О, ведае маці,
Аб чым гэта птушка на хаце
Шчабеча—быць скора гасцям.
Другі дзень стракоча сарока.
Пралегла дарога шырока,
Пабегла дарога далёка.
Далёка—за сінюю даль.
І маці падоўгу з парогу
Маўкліва глядзіць на дарогу,
Прагледзела вочы амаль.
Чакае усё маці сына:
— Калі-ж прыдзе стрэчы часіна?
Хутчэй прыязджай, дарагі!
Ты-ж знаеш, які падам рана
Я чай табе з мятай духмянай,
Якія спяку пірагі...
А нейдзе на тую-ж дарогу
З глыбокай сардэчнай трывогай
Дзявочыя вочы глядзяць.
І у іх—то надзеі іскрынка,
То горкага суму слязінка.
Не можа яна не чакаць.
Дзень трэці стракоча сарока.
Пралегла дарога шырока.
Пабегла дарога далёка.
Сын едзе дарогаю той.
Чакае усё маці сына,
І хлопца чакае дзяучына.
Куды-ж раней пойдзеш, хлапчына,—
Да маці, ці любай сваёй?

## НЕ ЛЮБЛЮ АДЗІНОТУ І ЦІШ...

*Не люблю адзіноту і ціш.*
*Пасядзіш у цішы бязлюднай,*
*Паглядзіш навокал, памаўчыш,—*
*Нават здасца і праца нуднай.*
*Локця друга табе не стае,*
*Нехапае сяброўскай парады,*
*Нехапае і шчырай спагады.*
*З кім падзеліш сумненні свае?*
*Мне такое жыццё падавай,*
*Каб кіпела яно цераз край,*
*Каб я чуў яго подых гарачы!*
*Я хачу быць сярод людзей,*
*Хачу слухаць шчэбет дзяцей,*
*Слухаць шопат любві юначай.*
*Тады—спорыцца праца мая,*
*Тады—стомы не ведаю я.*
*Не люблю адзіноту і ціш.*
*Вокны насцеж—дзень добры, вятры!*
*Дзверы насцеж—заходзьце, сябры!*
*Ну, хадзі-ка на рукі, малыш...*

## ФІЗКУЛЬТУРА І СПОРТ

# Спартыўны дзённік

У час зімовых канікул у Брэсце праходзіла зімовае першынство Беларусі па лёгкай атлетыцы. Выдатнага выніку у гэтых спаборніцтвах дабіуся студэнт II курса хімічнага факультэта Леанід Станішэўскі. Ён стау чэмпіёнам рэспублікі па прыжках у даўжыню. Яго вынік (6,81 метра)—новы рэкорд універсітэта, значна вышэй за нарматыў другога разраду.

* * *

З 9 па 15 лютага у спартыўнай зале стадыёна «Дынамо» праходзіла зімовае першынство рэспублікі па валейболу. У першынстве прымалі удзел зборныя каманды абласцей і спартыуных ведамствау. За другую каманду «Буравесніка» ігралі валейбалісты універсітэта.

* * *

2 сакавіка ў клубе імя Дзяржынскага будзе праведзен вялікі спартыўны вечар моладзі універсітэта, прысвечаны Спартакіядзе народаў СССР.

* * *

За перыяд зімовых канікул значна папоўнілася лыжная база ўніверсітэта. Набыта 75 пар лыж.

* * *

13 лютага пачнецца першынство універсітэта па шахматах.

Усяго у другім семестры намечана правесці больш 60 спартыуных мерапрыемстваў. Гэта роўна колькасці спаборніцтвау за ўвесь 1954—1955 навучальны год.

* * *

Пачаліся спаборніцтвы на асабістае першынство універсітэта па шахматах. У спаборніцтвах удзельнічаюць пяць першаразраднікаў, чатыры шахматысты другога разраду і пяць—трэцяга.

Адбыуся першы тур. Дземянцей выйграў у Зубовіча, Рудак у Стругала, Зузаў у Прамкоўскага. Астатнія партыі адкладзены.

## ПА СЛЯДАХ НАШЫХ ВЫСТУПЛЕННЯЎ

# „Гісторыя адкрыцця пральні“

**Матэрыял пад такім загалоўкам змешчан у № 1 нашай газеты. У ім расказвалася аб гісторыі адкрыцця пральні, аб тым, што і пасля яе «адкрыцця» студэнты не маюць магчымасці сціраць бялізну, таму што ў пакоі, адведзеным для сціркі бялізны, няма гарачай вады, тазікаў.**

**Прарэктар універсітэта па адміністратыўна-гаспадарчай рабоце тав. Бярэзін паведаміў рэдакцыі, што ў сучасны момант вядуцца работы па мантажу катла для падачы гарачай вады ў памяшканне, адведзенае для сціркі бялізны. Тазікі знаходзяцца ў каменданта інтэрната. Для сушкі бялізны адведзен асобны пакой.**

НАШ КАЛЯНДАР

# ВЯЛІКІ РУСКІ ПІСЬМЕННІК

## *(ДА 75-ГОДДЗЯ З ДНЯ СМЕРЦІ Ф. М. ДАСТАЕЎСКАГА)*

9 лютага савецкая грамадскасць і усе прагрэсіўныя людзі свету адзначалі 75 год з дня смерці вялікага рускага пісьменніка Ф. М. Дастаеўскага.

У творчай спадчыне Дастаеўскага знайшлі сваё праўдзівае рэалістычнае адлюстраванне многія характэрныя бакі сучаснага яму жыцця дарэвалюцыйнай Расіі. Прытрымліваючыся лепшых традыцый рускай класічнай літаратуры, ён з вялікай сілай выкрывау памешчыцка-буржуазнае грамадства, яго звярыную мараль і з вялікім болем і гневам гаварыў аб пакутах уніжанага, прыгнечанага і абяздоленага чалавека.

А. М. Горкі сказаў аб Дастаеўскім на Першым з'ездзе савецкіх пісьменнікаў: «Геніяльнасць Дастаеўскага бясспрэчна, па сіле выяўленчасці яго талент роўны можа быць толькі Шэкспіру».

Але ў той-жа час Горкі указваў на глыбокія супярэчнасці ў творчасці і светапоглядзе Дастаеўскага, які прайшоў складаны шлях мастака і чалавека.

Ідэйны саюзнік і паслядоўнік Белінскага ў маладосці, ён адыходзіць пасля ад вызваленчага руху і спрабуе абгрунтаваць свае пазіцыі, вылучаючы рэакцыйныя тэорыі «выратавання чалавецтва», адмаўляючыся ад рэальнай барацьбы за перабудову эксплуататарскага грамадства.

Першы твор пісьменніка, які зрабіў яго вядомым, — аповесць «Бедныя людзі». Адзначыўшы ў аповесці «талент незвычайны і самабытны», Белінскі указваў на тое, што яна з'яўляецца прамым прадаўжэннем гогалеўскай лініі ў рускай літаратуры і народжана у русле ідэй натуральнай школы.

З 1847 г. Дастаеўскі уступае у гурток Петрашэўскага; гэта быў натуральны крок у біяграфіі маладога пісьменніка, які адчуў палонны уплыў Белінскага, узняўшы голас у абарону абяздоленага люду. У гуртку Петрашэўскага аб'ядноўваліся прадстаўнікі перадавой рускай інтэлігенцыі. Светапогляд петрашэўцаў фарміраваўся пад непасрэдным уплывам філасофскіх ідэй Пушкіна, Герцэна, Белінскага і прагрэсіўных мысліцеляў і пісьменнікаў Захаду.

На адной з «пятніц» Петрашэўскага Дастаеўскі, прымаючы удзел у сходзе, чытае нелегальны рэвалюцыйны дакумент эпохі—«Пісьмо Белінскага да Гогаля».

Самадзяржаўе жорстка расправілася з петрашэўцамі, вынесшы смяротны прыгавор дваццаці аднаму удзельніку гуртка. 22 снежня 1849 г. Дастаеўскі ў ліку іншых прыгавораных да расстрэлу, у белым балахоне смяротніка і каўпаку, насунутым на вочы, чакаў пакарання. У апошнюю мінуту, калі салдаты ўжо ўзялі ружжы на прыцэл, было аб'яўлена аб «міласці цара»—замене смяротнага прыгавору катаргай.

Толькі у 1859 годзе пісьменнік атрымлівае дазвол жыць у Пецярбургу і вяртаецца да літаратурнай работы. Гады катаргі, зносіны з людзьмі з народа яшчэ больш паглыбляюць у свядомасці Дастаеўскага яго спачуванне да прыгнечанага чалавека. У той-жа час, надломлены і хворы, ён адчувае расчараванне ў ідэях утапічнага сацыялізма, губляе веру ў рэвалюцыйныя магчымасці інтэлігенцыі, бачачы яе бяссілле перад самадзяржаўем. У яго творах цяпер пачынае адчувацца прапаведзь пакорлівасці і рэлігійнага змірэння, паяўляецца рэакцыйная ідэя своеасаблівага культа пакуты, пры дапамозе якога быццам ачышчаецца душа чалавека, якая вызваляецца ад свайго вечнага грэху.

Яшчэ ў ранніх творах Дастаеўскага, аповесцях 40-х гадоў «Двайнік», «Гаспадыня» Белінскі адзначыў рысы, якія з'яўляюцца чужымі гуманізму і рэалізму і супярэчаць лепшым традыцыям рускай літаратуры. Паказваючы тут прыніжанага чалавека, Дастаеўскі быццам-бы заўсёды жыве ў яго душы—побач са станоўчымі імкненнямі кожны з'яўляецца носьбітам эгаістычнага і злоснага пачатку.

Гэты памылковы погляд атрымлівае сваё далейшае развіццё ў творах Дастаеўскага, напісаных пасля вяртання з катаргі. Але шлях вялікага мастака Дастаеўскага надзвычай складаны. Выступаючы з рэакцыйнай праграмай у публіцыстычных артыкулах сваіх часопісаў «Время» і «Эпоха» ў 60-я гады, а пасля, у 70-я гады—у перыядычным выданні «Дневник писателя» рэдагуючы часопіс абарончага лагеру «Гражданин», Дастаеўскі вёў палеміку і ў мастацкіх творах з ідэямі вялікіх рэвалюцыянераў-дэмакратаў Чэрнышэўскага і Дабралюбава. Прыкладамі падзення таленту мастака з'яўляецца яго «лобавая атака» супраць сацыялізма ў «Запісках з падполля» і злосны пасквіль супраць рускіх рэвалюцыянераў—раман «Д'яблы».

Пасля аднаўлення літаратурнай дзейнасці Дастаеўскі зноў напружана працуе, адчуваючы пастаянную нястачу. Пасля няўдачы з выданнем часопіса, які закрылі з-за недахопу падпісчыкаў, Дастаеўскі, ужо вядомы аўтар вялікіх раманаў, літаральна «бяжыць», па ўласнаму прызнанню, за мяжу ад праследавання сваіх крэдытораў.

Уражанні ад жыцця за мяжой паслужылі матэрыялам для «Зімовых заметак аб летніх уражаннях» і увайшлі ў многія іншыя мастацкія і публіцыстычныя творы. З абурэннем гаворыць пісьменнік аб бесчалавечнасці буржуазнай цывілізацыі і маралі, аб упадку культуры ў Францыі, як выніку перамогі буржуазіі.

Першыя аповесці Дастаеўскага, напісаныя ім пасля вяртання з ссылкі—«Сяло Сцяпанчыкава і яго жыхары» і «Дзядзюшкін сон», у духу гогалеўскага гумару і сатыры паказвалі жыццё памешчыцкай сядзібы і правінцыяльнага горада. Услед за гэтымі апавяданнямі адзін за другім ствараюцца творы «Уніжаныя і зняважаныя», раман, які абагульняе асноўныя матывы ранніх апавяданняў Дастаеўскага з жыцця абяздоленых жыхароў вялікага горада; «Запіскі з мёртвага дома», кніга аб царскай катарзе, у якой пісьменнік паказвае духоўнае багацце рускага народа, высокае пачуццё справядлівасці і любві да радзімы, найбольш значны з усіх сацыяльных раманаў Дастаеўскага «Злачынства і пакаранне», раманы «Ідыёт», «Д'яблы», «Падлетак» і апошні раман «Браты Карамазавы», у якім знайшлі сваё увасабленне усе важнейшыя тэмы і праблемы творчасці пісьменніка. Гэты далёка няпоўны пералік твораў гаворыць аб вялікай рабоце думкі і творчага ўяўлення мастака, які мог глыбока памыляцца і тут-жа, як-бы ў спрэчках з самім сабой, выкрываць свае памылковыя палажэнні, пропаведзь змірэння і ачышчанай пакуты, жывымі карцінамі сацыяльных супярэчнасцей, ізабражэннем чалавека, які пакутуе і пратэстуе.

Па закліку Сусветнага Савета Міру усё прагрэсіўнае чалавецтва разам з савецкім народам ушаноўвае памяць вялікага рускага пісьменніка, які змог увабраць у сваю творчасць боль і пакуты людзей і з суровай праўдай расказваў аб іх жыцці ва уласніцкім грамадстве.

**З. МЕЛКІХ,**
**кандыдат філалагічных навук.**

**Рэдактар А. ВОЛК.**

Адрас рэдакцыі: Мінск, Універсітэцкі гарадок, біякорпус, пакой 62, тэл. 2-07-19

АТ 02929 Друкарня выдавецтва БДУ. Зак. 223, Тыраж 2000.